# Выйшаў краязнаўчы зборнік Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

21.11.2013

Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі падрыхтаваны і выпушчаны зборнік “Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў”. У маі 2012 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся міжнародны навукова-практычны семінар “Бібліятэчнае краязнаўства: тэрыторыя вялікіх магчымасцей і перспектыў”, прысвечаны развіццю бібліятэчнага краязнаўства. Удзельнікамі семінара была выказана прапанова апублікаваць лепшыя даклады ў аднайменным зборніку. Таму большасць матэрыялаў выдання складаюць выступленні ўдзельнікаў. Але спектр краязнаўчай дзейнасці вельмі вялікі і для больш дэталёвага раскрыцця розных яго аспектаў было прынята рашэнне аб правядзенні дадатковага збору артыкулаў і метадычных распрацовак.

Зборнік артыкулаў складаецца з чатырох раздзелаў і адлюстроўвае найбольш актыўныя кірункі краязнаўчай работы бібліятэк на сучасным этапе: фарміраванне краязнаўчых калекцый у фондах бібліятэк, стварэнне электронных краязнаўчых рэсурсаў, узаемадзеянне бібліятэк з музеямі, архівамі, папулярызацыя краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў.

Шматаспектная змястоўнасць публікацый і іх формаў падачы скіравана на самую шырокую чытацкую аўдыторыю: ад даследчыкаў, вынаходнікаў, спецыялістаў у галіне краязнаўства да аматараў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.